## ЭКСПРЭС

У сталічным прыгарадзе, што ня так даўно яшчэ зваўся мястэчкам, трэці дзень запар скварыць і ў поўдзень ужо няма куды дзецца ад сьпякоты.

У лёджыю, што на другім паверсе цаглянага пяціпавярховіка, выходзяць дзьве жанчыны ў веку, сёстры Агата з Фрузаю.

— Зноў вечар задушлівы, — кажа Фруза. — Але твая праўда: на дварэ лягчэй як у кватэры.

— Сядай, зараз яшчэ зялёнага чаю пап’ем, і зусім хораша будзе. Вішні сёлета не ўрадзілі, але варэньне выйшла смачнае, як ты любіш — з косткамі.

Праз акуляры Агата пазірае на сваё вязаньне, а паверх іх — на сястру. Агата даўно ўжо пераканала сябе, што жыць ёй засталося нядоўга. Ня менш як раз на месяц выклікае "Хуткую дапамогу", на чым сьвет стаіць лае дактароў і патрабуе, каб везьлі яе ў сталіцу і лячылі ёй сэрца найлепшымі лекамі. Калі і бярэ яна ў рукі якую газэту, дык найперш прачытвае нэкралёгі, спачуваньні, а таксама калёнкі пад рубрыкамі накшталт "Здарэньні", "Крымінальная кроніка", "Нататкі з судовай залі", "Служба 02". Любую гутарку яна пераводзіць на крымінальныя тэмы.

— Гэта слухай сюды, — пачынае казаць Агата. — Сьвятая праўда ў Пісаньні — і пра зорку Палын, і пра тое, як цары мечаныя мяняюцца. У аднаго плямы на галаве былі, у другога пальцаў на руцэ не стае... Вось і Кузьнячыха казала мне, што хутка ўжо настане канец сьвету, бо чалавечымі душамі ўшчэнт завалодалі зайздрасьць, сквапнасьць ды лютасьць. Паглядзі-тка, што робіцца! Навокал — пыха і лянота, юрлівасьць і ненажэрнасьць. Ну скажы, што не?! Прымаюцца бясконцыя законы, пастановы ды ўказы, цэны скачуць,

як шалёныя, а людзі ўсё адно п’юць ня меней. Ці то вунь аб’явіліся нейкія наркаманы-таксыкаманы, пра якіх раней нават і ня чулі...

— А можа, гэта проста кепскія законы? — асьцярожна ўстаўляе Фруза. Яна пстрыкае запальнічкаю, глыбока зацягваецца і прадаўжае: — Можа, неяк паступова змагацца трэба было? А то павысякалі нават найкаштоўнейшыя вінаграднікі... Жыцьцё ёсьць жыцьцё: часам трэба якому шафёру ці сантэхніку заплаціць. Дык на грошы нават глядзець ня хочуць, бутэльку давай. Таму і мусіш нечага ўзяць у запас. Але жанчыне ці прыстойнаму чалавеку станавіцца ў п’яную чаргу — зьнявага і сорам.

— Твая праўда, — паблісквае пруткамі Агата. — Чэргі такія, што глянуць страх. Ці чула, на заводзе Нінку Зылеву ледзь не да сьмерці прыдушылі? А на "грэсе", непадалёк ад гэтай дэбільнай электрастанцыі, адзін быў дадумаўся ў чаргу ў манапольку скакаць...

— Як гэта? — пытаецца Фруза. Да апошняга часу працавала яна настаўніцаю ў пачатковых клясах, а як выйшла на пэнсію, дык уладкавалася гардэробшчыцаю на тэнісныя корты і таму, відаць, зрабілася неабыякаваю да спорту. — З разгону скача ці што?

— Ды не, цяпер ужо ніяк ня скача. А раней у дзьве гадзіны ці ў адзінаццаць, перад тым, як адчыняюць аддзел, выходзіў на свой балькон — а жыў ён па-над гастраномам, — крычаў, каб расступіліся, скакаў проста ўніз і апынаўся каля самага ўваходу. Ну дык жа ж даскакаўся — зламаў нагу і набыў мыліцы. Але зноў па-за чаргою, па блату.

— І не кажы, — уздыхае Фруза. — Як толькі ні пнуцца да гэтага зельля. У нас на бровары "Крышталь", што на Кастрычніцкай вуліцы, адзін гегемон хацеў быў зачэрпнуць, ды ўваліўся ў чан з гарачым вінам і зварыўся. А знайшлі яго толькі праз тыдзень, калі чысьцілі чаны. І труцяцца, і сьлепнуць,

а якой толькі брыды ня п’юць і з чаго толькі ня гоняць самагонку! І з таматнае пасты, і з карамэлі ў абгортцы, поліэтыленавыя торбы распускаюць, падсыпаюць для моцы "Сумгаіту"...

— Калі гоняць з螺знае гадасьці, дык хай бы і пілі самі. Дык не, на продаж робяць. Каля нас вунь, у вёсцы Будагова, цэлае вясельле патруцілася!

— Я ўжо не кажу, што цукру тыднямі ня купіш. А ведаеш, якое насеньне ў нас на базарах самае дэфіцытнае? Цукровых буракоў!

— А яшчэ што ў нас з самагонкай было! — жвавее Агата пасьля невялікае паўзы. — Міколу Бяляўскага помніш? — Фруза няўцямна паціскае плячыма, і Агата пачынае цярпліва тлумацыць: — Ды ведаеш ты, проста забылася. Сівы ўвесь, валасы кучаравыя. У Крушыньніку жыў. Як малады быў, дык хадзіў з Марыляю Сіманчык. Дзіця ёй зрабіў, а жаніцца не сьпяшаўся. Потым Пякарчыкі абкруцілі яго, абпаілі нечым дый запісалі дома зь іхняй Лімаю. Сястра ў яе стрыечная рабіла ў сельсавеце, дык і пячатку прынесла была... Ну, а ён як адышоў, ачомаўся, дык за дубальтоўку дый давай страляць сваю маладую жонку. Добра яшчэ, што не пацэліў, а то адседзеў бы не ў Навінках, а дзе-небудзь далей. Ну што, успомніла?

Фруза занятая варэньнем, а таму адно ківае. На цыраце паступова выцягваецца ланцужок з костачак. Агата ж нясьпешна адпівае з кубка і прадаўжае:

— Ну дык разьвёўся нядаўна той Мікола, атрымаў аднапакаёўку і жыве цяперака на заводзе. Пайшоў аднаго дня да суседкі пазычыць нейкае драбязы. Звоніць, звоніць, а тая не адчыняе. А ён дык напэўна ведае, што павінна быць дома — чуў, як толькі што зайшла. Спалохаўся — суседка старая зусім, хваравітая, ці не памерла раптам? Пагрукаў, пазваніў яшчэ ды пайшоў да

суседзяў. Зьбегалі па ўчастковага. Залез той да старой на балькон, зірнуў у вакно, а яна на кухні каля самагоннага апарату завіхаецца...

— Ну дык і ў нас у Менску было такое. Прыходзіць адзін да суседа-мастака, а ў таго на кухні на вяроўцы вісяць прышчэпленыя пяцірублёўкі — сушацца. "Слухай, адкуль у цябе гэтулькі?!" — пытаецца. "Машынка ў мяне ёсьць. Дык вось панадрукаваў і сушу", — сьмяецца той у адказ. "Слухай, пазычыў бы ты яе мне!" — "Не магу, самому толькі да заўтрага далі!" Ну дык пакрыўдзіўся гэты, пайшоў ды пазваніў куды трэба. Прыехалі з вобыскам і аказалася, што паджартаваў той мастак са свайго суседа. Проста атрымаў ён за нейкую халтуру пяцёркамі, але па дарозе дахаты патрапіў пад такую залеву, што змок да ніткі і мусіў сушыць грошы. І хоць ніякае машынкі ў яго, канешне, не было, калі спыталіся, сказаў, што пазычыў суседу. Пайшлі тады ў сумежную кватэру, да каго б ты думала? Якраз да таго, хто выклікаў іх як гэта... ананімна. Толькі знайшлі ў яго не фальшываманэтную машынку, а зноў жа — самагонны апарат.

— Што самагоншчыкі, што п’яніцы — як унадзяцца, дык да самай магілы. У нас вунь грузчыкі з пакгаўзу панабіралі пасьля палучкі "чарніла" дый пайшлі піць на могілкі. Селі на між бяроз каля сьвежай магілы. Выпілі па адной, па другой. Разьлілі па трэцяй, як раптам з-за вянкоў высунулася рука са шклянкаю, а потым і галава: "Мужыкі, наліце і мне!" Тыя прыціхлі... Аказалася потым, што пабудзілі нейкага дзядзьку, які з раніцы забурыўся паміж вянкоў і кветак. Мы з табою да сьмерці напалохаліся б, а яны толькі парагаталі дый налілі яму...

— Гэта што! Вось у нас, — ня хоча адставаць Фруза, — на Маскоўскіх могілках было восеньню! Паспрачаліся два хлопцы. Адзін кажа, што ўначы з магіл у самагубцаў ці то дух, ці то нейкі фосфар выходзіць, які нібыта можа

пагнацца і забіць, калі будзеш паблізу праходзіць. А другі сьмяецца, маўляў, усё гэта лухта. А каб давесьці, што нічога такога няма, пайшоў уначы на магілу да жанчыны, якая кінулася на рэйкі ў мэтро. Знайшоў ён магілу, апусьціўся на калені і, каб можна было засьведчыць, што і праўда прыходзіў сюды, забіў каменем калок — так дамаўляліся. Паспрабаваў устаць, каб сысьці, як раптам адчуў, што ня можа, бо яго нехта за крысо трымае. Дык ён ад страху няведама як вылузнуўся з плашча, зашпіленага на ўсе гузікі... Вярнуўся раніцою зь сябрам, глядзіць — а плашч ляжыць сабе на магіле, прыбіты ягоным, тым самым калком!

А на Паўночных могілках што было! Служыў там адзін за вартаўніка. Дык што рабіў, гад, — выкопваў мерцьвякоў, разьдзяваў іх ды прадаваў на барахолцы ўпрыгожаньні і адзежу.

— Няўжо праўда?! — ускрыквае Агата абурана і крыху недаверліва. — І як жа злавілі яго?

— Ды, лічы, выпадкова. Вялі сьледзтва па нейкай заблытанай справе і спатрэбілася правесьці эксгумацыю...

— Што, што?

— Ну, карацей, хацелі выкапаць цела забітага для дадатковай праверкі ці экспэртызы. А яго ў труне і няма. Пайшлі да вартаўніка — нічога, кажа, ня ведаю. Але потым не ўстрымаўся ён і праз колькі дзён зноўку пайшоў. Карацей, пачаў быў капаць, але падалося яму, што яго высочваюць. Кінуўся ён уцякаць, тузануўся ўбок, не агледзеўся ў цемры ды садануўся аб крыж на суседняй магіле і прабіў сабе скронь.

— Нешта чула я пра гэта ці нават чытала. Мярзотнік той нібыта і цэлы мерцьвякоў сёк ды скормліваў сьвіньням сваім...

— Ну, гэта ты ўжо занадта, — кажа Фруза, адсоўвае сподак з варэньнем і пазірае долу. Па сьцяжыне, пратаптанай наўскос газону, праходзіць чарнявы хлопец з напакаванай валізкаю і кіруецца ў бок аўтастанцыі.

— Што за ён? — пытаецца Фруза. — Твар нібыта знаёмы, а не пазнаю.

— Ды Ліды Казырэнка старэйшы сын, Сашка. Малодшы ў яе, гаротніцы, Толік, ліквідатарам быў. Дык памёр нядаўна ад раку крыві. Праўда, мэдыкі нейкі іншы дыягназ паставілі.

— Дык прымушалі ж хлусіць... Гэта ж яму ўсяго толькі гадоў трыццаць было?

— Ага. І такі ўжо харошы, ветлівы быў. Хаця і гэты, як ажаніўся, паспакайнеў. Рабіў раней на "БелАЗе", а цяпер у Менску, на нейкай Чыжоўцы. У прымы пайшоў.

— У Чыжоўцы? — перапытвае Фруза. — Гэта ж паслухай, што там было пазалетась. Ня ведаю, з-за кватэры ці праз грошы, але ў сварцы адна кабета забіла сякераю зяця. Вярнуўся толькі што з заробкаў з Лангепасу, хапіцца не было каму, але мусілі ж неяк хаваць сьляды. Ну дык маці з дачкою пасеклі яго на кавалкі, запакавалі ў чамаданы і павезьлі ўначы тапіць: ёсьць там, у Чыжоўцы, возера. Але як садзіліся ў аўтобус, дык адзін чамадан раскрыўся і павывальваліся зь яго кішкі, вантробы ды чалавечая рука. Ну, карацей, арыштавалі гэтых маці з дачкою. Потым пыталіся ў іх на судзе: "Як жа вы маглі такое ўчыніць?!" — "А што, — адказваюць, — мы ў вёсцы ўдзьвюх парсюка за паўгадзіны разьбіраем." Уяўляеш, во людзі: што парсюка разабраць, што чалавека — бяз розьніцы!..

Толькі ня ведаю я, ноч надыходзіць, а мы з табою пра гэткія жахі гаворым. Сасьніцца потым якая брыда. Мусіць, пайду я зьбірацца дый паеду ўжо дахаты.

— Ды куды табе сьпяшацца? Пасядзела б яшчэ, пабыла б. А то жывем, можна сказаць, побач, а бачымся рэдка. Якраз во да заўтрашняга і шалік табе давяжу. Добра? Мне весялей будзе, і табе яшчэ што-небудзь цікавае раскажу. Ну што, застанесься?

Фруза няпэўна паціскае плячыма, маўляў, можна і заначаваць, а Агата пасьпешліва прадаўжае:

— Слухай сюды, нядаўна ў нас выпадак быў. Чычын Андрэй, шафёр з аўтабазы, расказваў. Едзе гэта ён на Зялёны Бор, ня надта каб рана. Пасажыраў нямнога, ну і хлопец зь дзеўкаю на пярэднім сядзеньні. Дзеўку ён добра запомніў. Валасы, казаў, доўгія, белыя, а два верхнія зубы залатыя. Усё пасьміхалася яму ў люстэрка. Вылезьлі тыя хлопец зь дзеўкаю каля Судабоўскага возера. Андрэй, можа, і забыўся б на іх, ці мала хто езьдзіць. Але вось адпрацаваў ён зьмену, загнаў свой "пазік" у гараж ды агледзеў, што пад заднім сядзеньнем сумка стаіць. Адкрыў — а ў ёй галава той самай дзеўкі. Ляжыць ды ўсьміхаецца яму, і зубы залатыя блішчаць. Сталі шукаць, але не знайшлі нават цела, ня тое, што хлопца.

— І што толькі ня робіцца на гэтым транспарце! Толькі і чуеш: там вагоны ў таварняку ўзарваліся, там караблі ўрэзаліся, а там самалёт на пасадцы разьбіўся... — кажа Фруза і няўважліва пазірае на далягляд, дзе з-за дрэў лесапасадкі мільгаюць, адбіваючы сонца вокны цягніка-экспрэсу, прыслухоўваецца ды ледзь чутнага грукату ягоных колаў. А тым часам Агата пераключаецца на зусім іншае:

— Ну ты глянь на яго! Дыхаць і так няма чым, а гэты алкаш надумаўся палавікі выкалочваць, ды яшчэ ў сьвяты дзень. Абвешаўся, як наш вар'ят Іван Заруцкі чамаданамі... Вось ужо дзе бог пакараў — даў мне гэткіх суседзяў зьверху: то лаюцца цэлымі днямі, то гулі ў іх грымяць да позьняе ночы, а то вакно расчыняць і прыёмнік на ўсю гучнасьць уключаць. Жонка ў яго за прыбіральшчыцу ў гастраноме, дык штовечар паўнюткія сумкі валачэ дадому. Іначай сядзелі б галодныя: грошы да капейкі прапіваюць. Нядзіва, што дачка ў іх... як завуцца тыя, што ў сьне ходзяць?

— Лунатычка?

— Вось-вось, ходзіць уначы па пад'езьдзе ў адной кашулі — сама аднаго разу бачыла. А швагерка ў яго сядзіць у турме за крадзёж. Узялі яны пляменьнікаў да сябе. Дык малыя гэтыя то дзяўбуць нечым, то плачуць, то скачуць — хоць з дому ўцякай... Вось каб на яго ліха ды зь ягонымі палавікамі: увесь пыл сюды ляціць! А гэта слухай сюды, раскажу я табе, Фрузачка, што было, калі дамы гэтыя толькі засяляліся. Выбівае які-небудзь мужчына дываны, а тут выходзіць з суседняга пад'езду са сваімі другі, незнаёмы. У трыко, у пантофлях, адразу відаць, па-хатняму апрануты. Дык вось, падыходзіць ён і кажа: "Братка, выручай! Галава трашчыць, пахмяліцца трэба было б, а жонка-зьмяя, з дому толькі на хвіліну выпусьціла, дый цяпер, мабыць, праз вакно сочыць. Вось у мяне тут чырвонец з заначкі. Зьлётай у краму, прымем па сто грам, падлечымся, га?" Той ня супраць выпіць задарма, але вагаецца. "Ды ты не турбуйся, — супакойвае сусед, — я і тваё і свае павыбіваю!" Той нарэшце пагаджаецца, бяжыць у гастраном, вяртаецца з пляшкаю, а там — ні "суседа", ні дываноў.

— Гэта што, драбяза! Паслухай, як у нас каля "ЦУМу" аднаго дня папрацавалі. Уяўляеш, стаіць грузавік, а па бартах панавешаныя дываны, якія

ёсьць у продажы. Каса, чарга — усё, як мае быць. Выбіваюць чэкі і адсылаюць пакупнікоў на задні двор, на склад, які адкрыецца па абедзе. Безь пятнаццаці тры ўсё, маўляў, прададзена, дываны скручваюцца, машына ад'яжджае. Пакупнікі з паперкамі замест грошай ў руках цярпліва чакаюць пад складзкімі дзьвярыма. Чакаюць паўгадзіны, гадзіну, потым кідаюцца на месца злачынства. Машыны з "прадаўцамі", зразумела, даўно і сьлед прастыў. А дзе шукаць іх, ня могуць адказаць ні таваразнаўцы, ні галоўны адміністратар, ні нават сам дырэктар унівэрмагу.

— Так, злодзеі ды махляры бываюць розныя, — ківае Агата і ўсьміхаецца сваёй згадцы. — Але ніводзін зь іх не захацеў "Масквіча" нашага прапаршчыка Піліпенкі. Вуньдзека, стаіць каля шостага пад'езду, блакітны такі. Куды ён толькі ні ганяў яго — і ў Барысаў, і да вас на Чэрвеньскі — ніхто не бярэ.

— А што такое? Ён жа, здаецца, не пабіты?

— У тым і рэч, што навюткі. Але неяк паставіў яго ў гараж, а сам выпіўшы быў дый забыўся, што на заднім сядзеньні застаўся ягоны стары сабака. А раніцою, не пасьпеў і праспацца, паднялі яго па трывозе. Зьехаў ён на вучэньні, а покуль вярнуўся, сабака пасьпеў акалець. Выцягнуў ён таго сабаку, закапаў, але ў машыне застаўся такі смурод, што не далі рады ніякія асьвяжальнікі паветра з дэзадаранамі. Вырашыў ён тады прадаць машыну, ды ніводзін пакупнік ня здолеў выседзець за рулём.

— Ну, гэта, ведаеш, нават сьмешна. Ці ня той гэта прапаршчык, што, казалі, каля вайсковага гарадка напаў быў, хацеў згвалціць старую кабету?.. Раскажу і я гісторыю з сабакам, — падахвочваецца Фруза, так і не атрымаўшы адказу. — Карацей, з паўгода таму папаўзьлі па Менску чуткі, што адзін хлопец палюе на маладзіц, бо хоча адпомсьціць за тое, што заразілі

яго на пранцы, і што нібыта ўжо ёсьць чатыры ахвяры. Ён быццам бы падкрадаецца ззаду дзе-небудзь у цёмным завулку і брытвай пераразае жанчыне горла. У "Добрым вечары" пісалі, што ўсё гэта няпраўда, што ніякага маньяка няма, але ўсе ведаюць — няма дыму без агню. Дык вось, вярталася студэнтка з наргасу ўвечары дахаты, ішла празь лесапарк каля стадыёну "Трактар" і раптам чуе за сьпіною цьвёрды мужчынскі голас: "Стоять!" Спынілася небарака, а сама аж калоціцца ад страху. "Лежать!" — лягла на зямлю. Наступны загад "Ползи!" зьдзівіў яе больш, чым напалохаў ці абурыў. Азірнулася яна асьцярожненька, а там... нейкі сабакар-вайсковец ганяе, муштруе сваю аўчарку.

— Не, жарты жартамі, а ў нас вунь у доме, дзе "Экспрэс-кафэ", згвалціў адзін суседскую дзяўчынку-малалетку, а потым забіў. Уяўляеш, адзінаццаць нажавых раненьняў! Жанна Дамарацкая, што ў нашым пад’езьдзе жыве, калісьці выхавацелькаю была ў яе ў садку. Казала, што бедная маці ледзь не звар’яцела і ўсё дакарала яе: "Вы, Жанна Уладзіміраўна, вучылі верыць людзям. Вось яна і паверыла, адчыніла дзьверы, хоць я і забараняла".

— Гэта якая Жанка? Тоўстая, чарнявая такая?

— Ага. Ведаеш, самой хапіла: адна двух малых гадуе. Толік, мужык ейны, а такі харошы быў, дык утапіўся. Тым летам у нас на вадасховішчы як ніколі людзей патапілася. Казалі нават, што амэрыканцы, якія прыяжджалі на завод, запусьцілі нейкую зьмяю. Яна нібыта кусала плыўцоў і тыя танулі. Ня ведаю, адкуль тое пайшло, але Толік утапіўся не ад зьмяі і нават не ад сутаргі, а захлынуўся ванітамі. Пад чаркаю быў, але не збаяўся купацца, далёка заплыў... Затое сябар ягоны, Міхась, таксама майстар спорту па плаваньні, на Менскім моры, лічы, адзін выкрыў шайку "выратавальнікаў".

— Якіх выратавальнікаў? Нешта я ня чула, — перапытвае Фруза.

— Вось табе і маеш! Ты дзе жывеш? — зьдзіўляецца Агата, але ахвотна пачынае расказваць. — Ведаеш, калі ўтопіцца хто, дык сваякі даюць грошай аквалянгістам з выратавальнай станцыі, каб хутчэй знайшлі тапельца. Ну, дык двое дадумаліся што рабіць — убачаць, як хто заплыў далёка, падплывуць, за ногі ўхопяць дый топяць. Падсунуць пад які корч, а потым вымагаюць грошы ў сваякоў: то вада ім каламутная, то плыньню, маўляў, далёка аднесла... Дык вось напаў адзін на таго Міхася. А ён быў ня ўломак, счапіўся з "выратавальнікам" дый сарваў зь яго пад вадою маску.

— А тыя вадалазы, яны хто былі?

— Дык маладыя зусім, гадоў па дваццаць пяць, нейкія няўдалыя спартоўцы. Што і казаць, параспусьцілася, разбэсьцілася моладзь, далей няма куды! Раней ці чула ты пра гэтых, як іх, рэкеціраў ці рокераў? А цяперака разгорнеш газэту — вачам сваім ня верыш... Ці вось расказвалі мне, што неяк пад вечар залезла ў апошні вагон электрычкі, дзе народу мала было, вясёлая кампанія і наладзіла "прадстаўленьне". Уключылі яны магнітафон, а адзін хлопец зь дзеўкаю скінулі адзежу ды давай голыя скакаць. А пасьля кажуць: "Мы — мэталісты і вельмі любім "мэтал". Таму хутчэй ганіце за наш канцэрт мэтал, пажадана каштоўны!" Пазьбіралі яны ў пасажыраў грошы, гадзіньнікі, пярсьцёнкі ды ланцужкі і выскачылі на наступным прыпынку, у Сьцяпянцы. Мусіць, гэта якраз і былі тамтэйшыя гвалтаўнікі-садысты, што арудавалі зь дзеўкаю на чале. Хочаш, раскажу табе пра іх?

— Знайшла чым зьдзівіць! Думаеш, газэт не чытаю?

— Па цяперашнім сьвеце і не такое можа быць, — не супакойваецца Агата. — СПІД вунь разносяць, а ім толькі штраф...

— А ты што прапануеш? У цывілізаваных краінах даўно паадмянялі сьмяротную кару. Турмой, руднікамі, калёніяй ці псыхушкай таксама нікога

ня выправіш. Што было, тое і будзе... Людзі ніколі не былі лепшыя ці горшыя. Проста пісаць і гаварыць пра злачынствы сталі болей.

— Не, ты паслухай, што цяперака робіцца. Кажу табе, раней такога не было. У нас вунь у новым доме, што за трэцяю школаю, чулі людзі, як у адной кватэры ўвесь час, калі гаспадара дома няма, дзіця крычыць, аж заходзіцца. Казалі яму, а ён усё адмахваўся, ня верыў. Але аднойчы зрабіў выгляд, што пайшоў на працу, а праз паўгадзіны вярнуўся пад дзьверы і пачуў, што і праўда дзіця плача. Адчыніў ён паціху і бачыць: ягоная маладая жонка зьдзекваецца з пачаркі, проста катуе: пускае ў вены іголкі. Павёз ён дзіця на рэнтген, і ўбачылі на экране, што тыя іголкі да сэрца ўжо з усіх бакоў падступіліся...

— Іголкі... — недаверліва крывіцца Фруза. — Я вось магу расказаць, што і праўда ў нас у Менску было. Разьвялася ў Серабранцы сям’я. Мужык ціхі, спакойны, а жонка такая была, што суд ёй нават дзіця не пакінуў. Потым узяў той мужык другую, нарадзілася ў іх малое. А першая ўсё хадзіла ды чаплялася да былога мужа, патрабавала грошай. Аднаго разу так расхадзілася — кідалася біцца, а пасьля ўдала, што ў яе сардэчны прыступ. Мужык выбег па валідол да суседзяў. Вярнуўся, а ягонае немаўлятка ляжыць акрываўленае. Гэтая былая жонка адрэзала ў яго вушка брытваю, схавала і стала патрабаваць за яго тысячу рублёў выкупу. Уяўляеш?! Тут ужо мужык той ня вытрымаў, зьбіў яе на горкі яблык. А яна ўсё адно не прызнаецца, дзе схавала. Грошы, маўляў, гані і ўсё тут. Ды яшчэ зьдзекуецца: нічога страшнага, прышыюць, тры гадзіны яшчэ не прайшло. Ведала і час, бо, аж ня верыцца, працавала мэдсястрою.

— А куды яна вушка схавала?

— У халадзільнік, у маразілку.

— Вось бачыш, казала я, што раней такой лютасьці не было.

— Не было, не было... Ды пад час голаду ў Паволжы па вёсках елі сваіх дзяцей, а ты кажаш...

Фруза прыпальвае чарговую папяросу, а Агата адсоўваецца, разганяе дым рукою і кажа:

— Не курыла б ты столькі!

— Я была зусім кінула, ды бач, як распаўнела. Дый чаго мне баяцца? Здароўя таго ўсё адно няма...

— Твая праўда, — ахвотна падхоплівае Агата. — Паветра атручанае, нітраты кругом, розная хімія ды радыяцыя, ямо няведама што... Купрыяніха вось, маці геройская, сто восем гадоў пражыла, хоць курыла і выпіць не адмаўлялася. Нам столькі не пражыць і блізка. Дый каму мы патрэбныя, хіба што адна адной? Дзеці разьехаліся, у госьці не дазавесься... І чаго едуць, чаго шукаюць? Хіба на сваёй зямлі працы мала? А ў нас, паглядзі, панаехала людзей з-за сьвету. Чужы стаў народ, жодзінскіх амаль ня ўбачыш. Яшчэ адзін велізарны завод будуюць, а каля пераезду адкрылі вольнае пасяленьне. Хіба мала сваіх бандзюгаў?.. Пэтэвэшнікі ў нядзелю, казалі, паміж сабою да крыві пабіліся, а "шпулькі" на танцах у "зьвярынцы" хлопца з Вуглоў шылам закалолі...

— А ў нас, у сталіцы, думаеш, ня тое самае? Яшчэ горш... — Фруза адстаўляе свой кубак на сярэдзіну століка, пазірае на гадзіньнік і ўстае. — Якраз во па тэлевізары балбатня скончылася. Зараз пачнецца кіно "Усходні экспрэс". Ангельскі дэтэктыў, якраз тое, што табе даспадобы. Як твой "Гарызонт", яшчэ ідзе, не згарэў?

— Нашу дык нічога, паказвае, а вось маскоўскую праграму ня хоча браць, — кажа Агата і таксама падымаецца.

Сёстры выходзяць зь лёджыі ў пакой.

На стале застаюцца недавязаны шалік, посуд і ланцужок вішнёвых костачак.

У вокнах запальваецца роўнае ўтульна-жоўтае або трывожна-імпульснае блакітнае сьвятло. Па вуліцы, паўз аціхлы двор праносяцца канарэечна-жоўты "УАЗ" і бела-чырвоны "РАФік" з маланкава-зыркай міргалкаю.

1990

KAMUNIKAT.org